№ 10 кастрычнік 2011 г.

*О, Беларусь, мая шыпшына,*
*Зялёны ліст, чырвоны цвет!*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш.*
***Ул. Дубоўка***

# Шыпшына

***Бюлетэнь Пастаўскай раённай арганізацыі***
***Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны***

***"Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога дадзеная."***
***Францішак Багушэвіч***



## *У НУМАРЫ:*

**с. 2-3. - Нашы навіны пра беларускія справы.**
**Нашы сустрэчы**




**с.4-6. - Дзень беларускага пісьменства ў матэрыяле Ігара Пракаповіча «Свята беларускага слова ў Ганцавічах»**



**с. 7-8. - Да 120-годдзя ПАЭТА. «Лясун у творчасці Максіма Багдановіча»**

# НАШЫ НАВІНЫ

## АДКАЗ РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА НА ПРАПАНОВЫ ТБМ

Раённы выканаўчы камітэт паведамляе, што прапановы Пастаўскай раённай арганізацыі ГА «Таварыства беларускай мовы» аб пашырэнні ўжывання беларускай мовы на тэрыторыі раёна былі разгледжаны на пасяджэнні пры намесніку старшыні раённага выканаўчага камітэта Кейзік А.Э. з удзелам кіраўнікоў сацыяльнай сферы раёна.

Як Вам вядома, згодна з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі з'яўляюцца беларуская і руская мовы. Таму ў раённым выканаўчым камітэце надаецца ўвага ўжыванню і развіццю як беларускай, так і рускай мовы.

Па сутнасці Вашых прапаноў паведамляем:

У перадачах раённага тэлебачання «Паставы-ТБ» рэгулярна выходзяць у эфір беларускамоўныя перадачы ў навінавых сюжэтах. Тэмы гісторыі, культуры і мастацтва заўжды асвятляюцца на беларускай мове.

Для прадстаўлення ГА «ТБМ» эфірнага часу Вам неабходна звярнуцца ў рэдакцыю ДУ «Рэдакцыя праграмы радыё «Пастаўскае мясцовае радыё» і праграмы тэлебачання «Паставы-ТБ» з афіцыйнай заявай і канкрэтнымі прапановамі, якія не павінны пярэчыць статуту і агульнай канцэпцыі тэлеканала, а таксама існуючаму заканадаўству аб сродках масавай інфармацыі.

Паведамляем Вам, што афіцыйны сайт Пастаўскага раённага выканаўчага камітэта ствараецца Беларускім тэлеграфным агенцтвам (БЕЛТА) на ўмовах дагавору, як і многія іншыя сайты Віцебскай вобласці.

На сайце размяшчаецца інфармацыя на рускай і беларускай мовах. Матэрыялы на старонцы «Культура» выходзяць толькі на беларускай мове. Па пытаннях стварэння рэкламнай прадукцыі, размяшчэння ў грамадскім транспарце ладатковай інфармацыі паведамляем, што згодна

з рашэннем выканаўчага камітэта ад 3.03.08г. №261 «Аб размяшчэнні вонкавай рэкламы, яе сродках, рэкламы на аўтатранспартных сродках на тэрыторыі Пастаўскага раёна» у рэдакцыі рашэння ад 10.01.2010г. №29 сюжэт рэкламы прадастаўляецца заказчыкам, таму рэкламная інфармацыя, шыльды, лагатыпы і інш. вырабляецца на мове, якую выбірае заказчык і ўзгадняецца з аблвыканкамам.

Пры правядзенні афіцыйных сходаў і культурна-масавых мерапрыемстваў ва ўстановах культуры і адукацыі выкарыстоўваецца як руская, так і беларуская мовы. Праведзены аналіз паказвае, што каля 50% такіх мерапрыемстваў праводзіцца на беларускай мове.

Мы таксама лічым, што з боку раеннага выканаўчага камітэта, аддзела адукацыі, аддзела культуры. грамадскасці раёна аказваецца пастаянная падтрымка творчым людзям раена: пісьменнікам і паэтам, мастакам і народным майстрам, усім пазітыўным і разумным творчым праектам і праграмам, якія спрыяюць развіццю народнай творчасці і мовы.

Так, толькі за апошні час аказвалася падтрымка з розных крыніц пры выданні кніг і твораў Нафрановіча А.І., Пракаповіча І.М., Валодзькі А.А., Магільніцкага У.Я. і іншых.

У раёне надаецца пастаянная ўвага ўшанаванню класікаў беларускай літаратуры - Максіма Багдановіча, Уладзіміра Дубоўкі, Я.Коласа, Я.Купалы і многіх іншых. Так з нагоды юбілейных дат і знамянальных падзей ладзяцца розныя сумесныя мерапрыемствы і ўрачыстасці, святы і акцыі, якія праходзяць у ўстановах адукацыі і культуры, у працоўных калектывах і па месцы жыхарства.

Менавіта да дня нараджэння У.Дубоўкі і М.Багдановіча распрацаваны

мерапрыемствы ўстановамі культуры і адукацыі, у тым ліку цэнтральнай раённай і дзіцячай бібліятэкамі. Акрамя таго, пастаўчане ганарацца тым, што дзіцячая бібліятэка носіць імя У.Дубоўкі.

Для правядзення акцыі ГА "ТБМ» - велапрабегу па вуліцах горада Паставы - Вам неабходна афіцыйнна звярнуцца ў раённы выканаўчы камітэт з пісьмовай заявай згодна з дзеючым заканадаўствам.

Іншыя прапановы раённай арганізацыі ГА «ТБМ» будуць улічаны пры распрацоўцы, падрыхтоўцы і правядзенні ўсіх праграм і мерапрыемстваў, якія ставяць мэтай пашырэнне ўжывання беларускай мовы, выхаванню патрыятызму і любові да роднага краю.

Удзячны за ўвагу да пытанняў захавання і развіцця беларускай мовы, культуры і народных традыцый, Ваш асабісты ўдзел у вырашэнні гэтых праблем.

Спадзяёмся на далейшае супрацоўніцтва па падтрымцы дзяржаўнай мовы.

Згодына з ар.1.3. Указа Прэзоэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.10.2007г. №498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб» вынік разгляду дадзенага звароту Вы маеце права абскардзіць у Віцебскім выканаўчым камітэце па адрасу: 210010, вул.Гогаля, д.6, г.Віцебск.

Намеснік старшыні А.Э.Кейзік

## НАШЫ СУСТРЭЧЫ

Апошнім часам сябры пастаўскай раённай арганізацыі ТБМ правялі шэраг у сустрэч у школах і сельскіх бібліятэках раёна. Яны наведалі Варапаева, Юнькі, Муляры, Камаі, Лынтупы. У час гэтых спатканняў вяліся зацікаўленыя гутаркі пра стан роднай беларускай мовы, пра літаратурную творчасць і краязнаўства, гучала шмат вершаў, песень, празаічных твораў, прэзентаваліся кнігі і выданні Ігара Пракаповіча. Разам з аўтарам актыўнымі ўдзельнікамі сустэч былі Людміла Сяменас, Людміла Логінава, Наталля Пракаповіч



*Сустрэча ў Варапаеўскай бібліятэцы*

# СВЯТА БЕЛАРУСКАГА СЛОВА Ў ГАНЦАВІЧАХ

Дзень беларускага пісьменства – адметнае свята ў календары духоўнага жыцця беларускага народа. Стаўшы традыцыйным, яно кожны верасень прыцягвае да сябе ўвагу грамадскасці, кожны жыхар Беларусі ведае пра гэту падзею. Адметнасцю свята з'яўляецца тое, што яно не мае сталай прапіскі ў нейкім адным горадзе, а вандруе па краіне, наведваючы параўнальна невялікія




раённыя цэнтры, надаючы ім штуршок для эканамічнага і культурнага развіцця. Ужо восемнаццаць разоў святкаваўся Дзень беларускага пісьменства ў нашай краіне. У 2006 годзе яно гасцявала ў Паставах, а сёлета 3-4 верасня яго прымаў горад Ганцавічы, што на Брэстчыне.

Атрымаўшы запрашэнне наведаць гэты горад у складзе дэлегацыі пісьменнікаў Віцебшчыны, некаторы час вагаўся – ехаць ці не? Як думалася? Лепш, чым у Паставах свята арганізаваць і правесці немагчыма, ды і што вядома пра Ганцавічы: невялічкі гарадок, дзе жыве шаснаццаць тысяч жыхароў, які за ўсю сваю гісторыю ніколі "не засвяціўся" ні нейкай адметнай падзеяй, ні помнікамі, ні культурніцкімі з'явамі. Чым гэты горад можа здзівіць?




І ўсё ж, далучыўшыся да дэлегацыі з Глыбокага, з трох гадзін ночы і да дзевяці раніцы ехаў на мікрааўтобусе на тое далёкае Палессе. Стомленасць дарогай яшчэ больш зменшыла невялікі энтузіязм, які быў перад паездкай.

Але маё скептычнае стаўленне пачало разбурацца ўжо на пад'ездзе да Ганцавічаў. За некалькі кіламетраў ад горада пры дарозе нас сустракала вялізная святочна ўбраная цётка-лялька, якая весела запрашала гасцей на ўрачыстасць. Яшчэ праз пару кіламетраў наш мікрааўтобус абагнаў строката размаляваны воз, які цягнуў саламяны конік. На возе сядзелі бадзёрыя лялечныя мужык і баба, якія таксама, падобна, спяшаліся на свята. Склалася ўражанне, што гэта былі госці з Расіі, бо на грудзях у гаспадара вісела вялікая балалайка.

Ускраіны Ганцавічаў больш нагадвалі вёску і ніякім чынам не паказвалі таго, што тут мусіць адбыцца імпрэза агульнабеларускага маштабу. Але варта было патрапіць у цэнтр, як усе сумненні адразу зніклі. Тое відовішча, якое раскінулася перад вачыма, сведчыла, што горад сур'ёзна і адказна падрыхтаваўся да Дня беларускага пісьменства. Ды, відаць, і не толькі горад, а ўвесь гэты палескі рэгіён,




бо часта сустракаліся шыльды і рэклама з Лунінца, Століна, Баранавічаў ды іншых бліжэйшых гарадоў.

Прыехаўшы за тры гадзіны да афіцыйнага пачатку ўрачыстасцяў, мы мелі выдатную магчымасць спакойна прагуляцца па казачных панадворках, якія ўзвялі руплівыя рукі мясцовых умельцаў, дызайнераў, мастакоў і рабочых. На гарадской плошчы цэнтральнае месца займала галоўная сцэна з сімволікай Дня пісьменства, абапал якой размяшчаліся гербы ўсіх гарадоў, якія раней прымалі гэта свята. Прыгожа сярод іх глядзелася пастаўская сетачка з залатымі рыбкамі.

Ад плошчы ў розныя бакі адыходзілі тры галоўныя вуліцы, якія былі шчыльна застаўлены павільёнамі, экспазіцыямі, шапікамі народных майстроў, магазінчыкамі, невялікімі сцэнічнымі пляцоўкамі. Над усім гэтым плыў пах смажаных шашлыкоў, водар печыва, хвалі беларускай музыкі. Варта адзначыць, што кожны павільён меў не адну-дзве, а добры дзесятак, як зараз модна называць, "фішак" – цікавых інсталяцый, каля якіх немагчыма было прайсці абыякава. Прычым, у розных варыянтах абыгрываліся тэмы пісьменства, кнігі, творчасці пісьменнікаў, асабліва мясцовых. Уражвала вялікая кніга-пірог, на якую з усёй акругі зляталіся восы, каб паласавацца салодкім, яшчэ большая па памерах кніга з важкімі лістамі сала, кніга-здоба з вершам "Наказ сыну", які выпісаны маслам. Прыцягваў увагу арыстакратычны салон, створаны па матывах паэмы М. Гусоўскага "Песня пра зубра". Збіраліся людзі і каля невялікага акварыума, у якім плавала дзікая качка і два вялізныя самы. Але гэтыя прыклады – усяго мо тысячная частачка тых атракцый, якія вабілі да сябе.

Бліжэй да галоўнай сцэны свае павільёны прадстаўлялі вядомыя беларускія выдавецтвы: "Мастацкая літаратура", "Беларусь", "Літаратура і мастацтва" і іншыя. Шырока выстаўлялася мясцовая і рэспубліканская прэса, новыя выданні кніг. Сярод выстаў выдзяляліся экспазіцыі, прысвечаныя 130-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа і 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

На другой вуліцы вельмі прываблівалі вясковыя панадворкі, створаныя і аздобленыя асобнымі сельскімі саветамі Ганцавіцкага раёна. Яны дэманстравалі духоўнае багацце сваіх мясцін: знаёмілі з вядомымі жыхарамі вёсак, паказвалі вырабы ўмельцаў,

Шыпшына

частавалі рознымі прысмакамі і напоямі, сярод якіх былі і моцныя самаробныя. На кожным панадворку ўсіх, хто заходзіў, прымалі як найдаражэйшых гасцей, паказвалі, расказвалі, частавалі не толькі тым, што было на сталах, але і народнымі песнямі і танцамі.

Афіцыйнае адкрыццё Дня беларускага пісьменства адбылося на плошчы. Перад удзельнікамі з прывітальнымі словамі выступілі ...Тозік, ... Сумар, ...Смоляр. Усе яны прамаўлялі на добрай беларускай мове і тым самым задалі тон усяму мерапрыемству. Гледачам паказалі літаратурна-музычную кампазіцыю, пасля чаго на сцэну былі запрошаны пісьменнікі – лаўрэаты прэмій Саюза беларускіх пісьменнікаў у розных намінацыях. Сярод іх – драматург і публіцыст з Глыбокага Уладзімір Сауліч.




Пасля ўрачыстай часткі адбылося адкрыццё алеі пісьменства, на якой усталявана некалькі невялікіх памятных знакаў, дзе выбіты прозвішчы вядомых мясцовых літаратараў, а таксама помнік Якубу Коласу, які ў маладосці некаторы



час жыў і працаваў на Ганцаўшчыне і напісаў тут некалькі сваіх твораў. Між іншым, ва ўсім адметна заўважалася паважлівае стаўленне да сваіх мясцовых аўтараў, ды і, наогул, да свайго, тутэйшага. Цытаты з твораў, фотаздымкі і малюнкі мясцовых краявідаў, вырабы народных майстроў, сярод якія выдзяляліся яркія прыгожыя бела-чырвоныя вышыванкі рушнікоў, сурвэтак, посцілак і іншага начыння.

Урачыстая частка незаўважна перайшла ў народныя гулянні. На невялікіх сцэнах (а іх было каля дзесяці) амаль без перапынку выступалі мясцовыя калектывы і выканаўцы. Людзі таньчылі пад музыку, падпявалі, або бавілі час за столікамі ў вялікіх кампаніях сяброў, родзічаў і знаёмых. Гасцей на свяце было багата. Заўважыў, што вельмі ўтульна было адчуваць сябе ў тых святочных хвалях, якія віравалі над Ганцавічамі, у той беларускай атмасферы, якая была насычана родным словам, музыкай і спевамі.

Закончыўся Дзень беларускага пісьменства вялікім канцэртам і сімвалічнай перадачай эстафеты гаспадарам наступнага падобнага свята. У верасні 2012 года усіх прыхільнікаў беларускага слова будзе прымаць горад Глыбокае і пастаўчане маюць добрую магчымасць стаць актыўнымі ўдзельнікамі святочных мерапрыемстваў.

*Ігар Пракаповіч*
*фота аўтара*

# Л Я С У Н
## у творчасці Максіма Багдановіча



Сёлета, 9 снежня, спаўняецца 120 год з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Многія вобразы яго паэзіі неадлучна звязаны з фальклорам. Адным з адметных персанажаў яго вершаў быў змрочны гаспадар пушчаў і бароў – Лясун. Менавіта міфічная істота дала назву цэламу паэтычнаму цыклу ў творчай спадчыне паэта. Хто ж такі Лясун? І якія думкі і пачуцці звязваў з ім наш вядомы пісьменнік?

Як паведамляе адна крыніца, *Лясун (лесавік, лешы) – «лясны цар», валадар усёй лясной жывёлы. Росту ён звычайна як тыя дрэвы, побач з якімі знаходзіцца, кульгавы, лысы, з зялёнымі валасамі; па іншай версіі – стары з белым тварам і велізарнымі вачыма, што ніколі не закрываюцца. Гэта надзвычай варожа настроеная супраць чалавека істота. Яго галоўная мэта – спужаць, заблукаць чалавека ў лесе і, згуртаваўшыся з вадзянікам ды балотнікам (хаця яны варагуюць паміж сабой) звесці чалавека ў багну ці вір. Забабоны ад лесуна – пры ўваходзе ў лес назваць аблудны накірунак шляху ці надзець вопратку навыварат.*

*Лешы мае Ляшуху, але іх дзіця жыве самастойна, а самі яны выхоўваюць скрадзенага нехрышчонага немаўлятку. У самых глухіх гушчарах жыве пушчавік, – бязлітасны, схільны да забойства чалавека нячысцік; адзінае, што можа выратаваць падарожніка – падслепаватасць пачвары.*

Друга крыніца ўдакладняе: *Абсяг дзейнасці Лясуна – уся лясная плошча ад узлеску да ўзлеску, за выключэннем вадаёмаў, дзе гаспадарыць Вадзянік. У глыбіні гэтай тэрыторыі знаходзіцца дом Лесавіка, дзе жывуць яго жонкі і дзеці. Сам жа ён дома не сядзіць – больш вандруе, адпачывае і начуе ў выпадковых мясцінах: на вершалінах высокіх дрэў, у дуплах, густых зарасніках, у ламаччы, бураломах, у лагчынах і прадоннях. Хаця Лясун здольны прымаць розныя воблікі, ператварацца ў любыя прадметы свайго абсягу, але часцей за ўсё паўстае ў вобразе старога з белым, як бяроста ці як воск, ніколі не загарэлым тварам, з вялізнымі цьмянымі вачыма свінцова-сіняга колеру, якія нерухомыя і ніколі не закрываюцца. Лясун здольны перадаваць галасы жыхароў свайго краю – ад мядзведжага рыку да піску камара.*

*Чуеш гул? – Гэта сумны, маркотны лясун*
*Пачынае няголасна граць:*
*Пад рукамі яго, навяваючы сум,*
*Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн,*
*Танкаствольныя сосны звіняць.*

*Ці казаць, ад чаго пацямнела рака,*
*Зашамрэлі мацней каласы*
*І аб чым шэпча ім галасок вецярка,*
*Што зіяе-дрыжыць на лісцёх лазняка:*
*Кроплі слёз ці халоднай расы?*

## *Хрэсьбіны лесуна*

*Бор шумеў, навяваў зводны сон,*
*А у ім ціхі гул разліваўся -*
*Гэта ў небе лясун калыхаўся*
*На вяршынях вялізных сасон.*
*Яму месяц маркотны свяціў,*
*Падымалі крыжы ў неба елі,-*
*І у сіняй нябеснай купелі*
*Душу дзікую ён ахрысціў.*

## *Лясун*

*Сосны, елі, хвоя, хвошчы,*
*Цёмны мох.*
*Чую я – лясун касматы*
*Тут залёг.*
*Паваліўся ён на хвою,*
*На кару,*
*І усім калышэць, дзвіжэць*
*У бару.*

## *Возера*

*Стаяў калісь тут бор стары,*
*І жыў лясун у тым бары.*
*Зрубалі бор – лясун загінуў,*
*Во след яго ад той пары:*
*Сваё люстэрка ён пакінуў.*

*Як у нязнаны свет акно,*
*Ляжыць, халоднае, яно,*
*Жыццё сабою адбівае*
*І ўсё, што згінула даўно,*
*У цёмнай глыбіні хавае.*



*Прывольная, цёмная пушча:*
*Вялізныя ліпы, дубы,*
*Асіннікі, ельніка гушча,*
*Між хвоі апаўшай – грыбы.*

*Ўсё дзіка, пустынна імшыцца,*
*Агністая спёка стаіць.*
*На моху між спелай брусніцы*
*Лясун адзінокі ляжыць.*

*Каравая моршчыцца скура,*
*Аброс цёмным мохам, як пень,*
*Трасе галавою панура,*
*Бакі выгравае ўвесь дзень.*

*Гляджу на яго я уныла,-*
*На сэрцы і жаль, і жуда:*
*Ўсё знікла – і ўдаласць, і сіла!*
*Прапала, як дым, як вада!*



**Шыпшына**
*Выданне Пастаўскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны*

Адказны за нумар: Ігар Пракаповіч

Адрас: 211875, горад Паставы, вул. Паркавая, 52. Тэл.: 02155-4-44-75

Вёрстка: Ігар Пракаповіч

*Рэдакцыя можа не падзяляць думкі аўтараў друкаваных матэрыялаў*

*Надрукавана на абсталяванні сяброў, распаўсюджваецца дарма*

*Наклад 100 асобнікаў*